**Н. П. Цімашэнка**
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ВЫКАРЫСТАННЕ МОДУЛЬНА-РЭЙТЫНГАВАЙ СІСТЭМЫ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА (СІНТАКСІС)»

Дысцыпліна «Сучасная беларуская мова (сінтаксіс)» вывучаецца студэнтамі-філолагамі 2 курса спецыяльнасці «Руская філалогія» ў першым семестры навучальнага года. Згодна з вучэбным планам вышэйадзначанай спецыяльнасці на дадзеную дысцыпліну адводзіцца 140 гадзін. З іх 68 гадзін аўдыторных(24 лекцыйныя гадзіны, 40 практычных і 4 гадзіны на выкананне лабараторных работ). Выніковай формай справаздачнасці з’яўляецца экзамен, які з 2019–2020 навучальнага года праводзіцца ў камбінаванай форме.

Ужо не першы год уГДУ імя Ф. Скарыны па многіх дысцыплінахвыкарыстоўваецца модульна-рэйтынгавая сістэма ацэнкі ведаў, асаблівасць якой заключаецца ў падзеле дысцыпліны на модулі – лагічна завершаныя раздзелы, што аб’ядноўваюць шэраг тэм. За кожны модуль прадугледжваецца асобная адзнака, якая ўлічваецца пры выстаўленні выніковай. Увядзенне новай сістэмы дапамагае студэнтам актыўна вучыцца на працягу кожнага семестра.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Напрыклад, калі раней узровень ведаў будучых філолагаў спецыяльнасці «Руская філалогія» па дысцыпліне «Сучасная беларуская мова (сінтаксіс)» вызначала адзнака, атрыманая на экзамене, то зараз яе значнасць складае толькі 40 %. Астатнія 60 % студэнт назапашвае за кошт актыўнасці на лекцыйных і практычных занятках, а таксама ўдзелу ў канферэнцыях, семінарах, навукова-даследчай рабоце. Варта адзначыць, што новая сістэма павышае матывацыю студэнта да падрыхтоўкі на працягу ўсяго перыяду навучання і выключае стрэсы і нечаканасці, якія могуць узнікнуць на экзамене.

Прымяненне модульна-рэйтынгавай сістэмы дапамагае выкладчыку ўбачыць, як працаваў студэнт. Калі навучанне было планамерным, да выніковага кантролю студэнт выходзіць з высокімі баламі, і ў большасці выпадкаў выніковая адзнака таксама будзе добрай.

Вартасці модульна-рэйтынгавай сістэмы заключаюцца ў наступным:

1. Мэты навучання дакладна суадносяцца з дасягнутымі вынікамі кожнага студэнта.

2. Распрацоўка модуляў дазваляе ўшчыльніць інфармацыю па вывучаемай дысцыпліне і падаць яе блокамі, тым самым павысіць якасць вывучэння і засваення матэрыялу.

3. Паэтапны кантроль ведаў і практычных уменняў дае пэўную гарантыю эфектыўнасці навучання і ўзроўню атрымання прафесійных кампетэнцый.

4. Забеспячэнне высокага ўзроўню актыўнасці студэнтаў на занятках садзейнічае матывацыі студэнтаў да ўсебаковага развіцця, да рэгулярнай і сістэматычнай работы ў працэсе атрымання ведаў і засваення вучэбнага матэрыялу на працягу ўсяго семестра.

5. Выяўленне найбольш актыўных і перспектыўных студэнтаў.

6. Фарміраванне навыкаў самаадукацыі ў студэнтаў.

7. Павышэнне аб’ектыўнасці выніковай адзнакі, павелічэнне яе залежнасці ад штодзённай работы студэнта на працягу семестра.

8. Інфармацыйная адкрытасць сістэмыз’яўляецца тым фактарам, які стымулюе вучэбную дзейнасць і дае магчымасць студэнтам супаставіць вынікі свайго навучання з вынікамі аднакурснікаў.

Безумоўна, выкарыстанне модульна-рэйтынгавай сістэмы дапамагае ў найбольшай ступені задзейнічаць увесь матывацыйны блок і розныя каналы прыёму-перадачы вучэбнай інфармацыі, якія ўздзейнічаюць на студэнтаў. У гэтым выпадку ад выкладчыка патрабуецца высокая канцэнтрацыя і адпаведны інтарэс да навучальнага працэсу. Дадзеная сістэма кантролю і ацэнкі якасці ведаў накіравана на высакаякасную падрыхтоўку спецыялістаў, глыбокае засваенне студэнтамі дысцыпліны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і ўключае ўсебаковую ацэнкуработы студэнтаў у семестры, а таксама яе ўлік пры выстаўленні выніковай адзнакі на экзамене.

Кожны модуль – гэта лагічна завершаная частка (раздзел) дысцыпліны «Сучасная беларуская мова (сінтаксіс)», якая ўключае ў сябе двааспекты: пазнавальны (інфармацыйны), задачай якога з'яўляецца фарміраванне тэарэтычных ведаў, і вучэбна-прафесійны, у задачы якога ўваходзіць фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў на аснове набытых ведаў. Пазнавальны аспект можа быць рэалізаваны з дапамогай такіх форм вучэбнай дзейнасці, як лекцыя, семінар, гутарка, работа з асноўнай і дадатковай літаратурай, апорныя канспекты, кансультацыі з выкладчыкам. Практычны аспект рэалізуецца за кошт практычных заняткаў, самастойных і лабараторных работ, тэстаў. Для ацэнкі ведаў пры модульна-рэйтынгавым навучанні выкарыстоўваецца рэйтынгавая адзнака. Пад рэйтынгам разумеецца сума балаў, набраная студэнтам на працягу некаторага прамежку часу, падлічаная па формуле, распрацаванай для пэўнай дысцыпліны.

На першых занятках выкладчык тлумачыць студэнтам сістэму ацэнкі ведаў, якая будзе выкарыстоўвацца пры вывучэнні дысцыпліны. Рэйтынг-план прадугледжвае ацэньванне вынікаў навучання студэнтаў пры дапамозе балаў, устаноўленых выкладчыкам за кожны від работы. Затым у працэсе навучальнай дзейнасці выкладчык ацэньвае выкананне студэнтамі абавязковых работ, прадугледжаных рэйтынг-планам, вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу, выкананне хатніх заданняў, даклады і паведамленні, самастойныя, лабараторныя, кантрольныя работы і г.д.

Пры выкарыстанні модульна-рэйтынгавай сістэмы і кабінаванай формы правядзення экзамену кантроль за авалоданнем вучэбнага матэрыялу па дысцыпліне «Сучасная беларуская мова (сінтаксіс)» ажыццяўляецца наступным чынам:

1) Увесь курс навучання разбіваецца на чатыры тэматычныя модулі («Прадмет і задачы сінтаксісу. Словазлучэнне», «Просты сказ», «Складаны сказ», «Пунктуацыя»).

2) Складаецца графік правядзення кантрольных мерапрыемстваў па дысцыпліне, які зацвярджаецца дэканам філалагічнага факультэта. Гэта інфармацыя даводзіцца да ведама студэнтаў на першых занятках.

3) 3.Пасля вывучэння кожнага модуля праводзіцца поўны кантроль ведаў студэнтаў з выстаўленнем адзнакі ў балах.

4) У канцы навучання падводзяцца вынікі і вызначаецца агульная сума балаў за ўвесь перыяд, якая даводзіцца да ведама студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

5) На экзамене па дысцыпліне выніковая адзнака выстаўляецца з улікам сумарнага рэйтынгу за семестр і адзнакі за тэсціраванне, памножанай на адпаведны вагавы каэфіцыент.

Становіцца відавочна, што модульна-рэйтынгавая сістэма прадугледжвае пастаянны кантроль ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў-філолагаў, які ажыццяўляецца выкладчыкам сістэматычна на працягу семестра і пасля вывучэння асобных тэм і раздзелаў курса з абавязковым выстаўленнем адзнак. З другога боку, модульна-рэйтынгавая сістэма павышае матывацыю студэнтаў да актыўнай і сістэматычнай вучэбнай дзейнасці, павышае якасць навучання, уносіць у адукацыйны працэс элементы спаборніцтва.

Паспяховасць вучэбнай дзейнасці студэнтаў спецыяльнасці «Руская філалогія» па дысцыпліне «Сучасная беларуская мова (сінтаксіс)» ацэньваецца як сума балаў па ўсіх відах вучэбнай работы і прадугледжвае выкарыстанне вагавых каэфіцыентаў для бягучага і выніковага кантролю ведаў.Індывідуальны рэйтынг студэнта па вышэйадзначанай дысцыпліне разлічваецца па кожным модулі і тэсціраванні на экзамене зыходзячы з наступных палажэнняў:

− сярэдні бал за засваенне модуля «Прадмет і задачы сінтаксісу. Словазлучэнне» – 10 % выніковай адзнакі;

− сярэдні бал за засваенне модуля «Просты сказ» – 10 % выніковай адзнакі;

− сярэдні бал за засваенне модуля «Складаны сказ» – 20 % выніковай адзнакі;

− сярэдні бал за засваенне модуля «Пунктуацыя» – 20 % выніковай адзнакі;

− бал за тэсціраванне на экзамене – 40 % выніковай адзнакі.

Кафедрай беларускай мовы прадугледжана таксама сістэма «штрафаў» і «бонусаў». Так, за няздадзены тэарэтычны мінімум або за сістэматычныя пропускі заняткаў па няўважлівых прычынах выніковая адзнака зніжаецца на 0,5 бала.

З другога боку, студэнт можа зарабіць дадатковыя балы (ад 0,5 да 1 бала) за іншыя віды вучэбнай і навуковай работы, не прадугледжаныя планам дысцыпліны (выкананне заданняў павышанага ўзроўню складанасці, напісанне рэфератаў, удзел у канферэнцыях і інш.).

Выніковая адзнака разлічваецца па наступнай формуле:

$$(M1 \times 0{,}1) + (M2 \times 0{,}1) + (M3 \times 0{,}2) + (M4 \times 0{,}2) + (T \times 0{,}4),$$

дзе М – модуль; Т – тэст; 0,1; 0,2; 0,4 – вагавыя каэфіцыенты.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Напрыклад, па выніках рэйтынг-кантролю студэнты Іваноў і Пятроў маюць наступныя паказчыкі:

| Студэнт | Модуль 1 | Модуль 2 | Модуль 3 | Модуль 4 | Тэст на экзамене |
|---|---|---|---|---|---|
| Іваноў | 10 балаў | 9 балаў | 7 балаў | 8 балаў | 10 балаў |
| Пятроў | 4 балы | 6 балаў | 7 балаў | 5 балаў | 4 балы |

Пасля падлікаў выніковая адзнака Іванова– 8,9. Акругляем да 9 балаў. Выніковая адзнака Пятрова – 5 балаў. Калі студэнт хоча павысіць сваю адзнаку за экзамен, то праводзіцца гутарка па экзаменацыйных білетах. Калі студэнт пагаджаецца з выніковай адзнакай, то яна выстаўляецца ў экзаменацыйную ведамасцьбез апытвання па білетах.

Такім чынам, модульна-рэйтынгавае навучанне не патрабуе якой-небудзь істотнай перабудовы вучэбнага працэсу, а добра спалучаецца з заняткамі ў рэжыме тэхналогій асобасна-арыетаванага навучання; складае ўмовы для матывацыі самастойнасці студэнтаў-філолагаў сродкамі своечасовай і сістэматычнай ацэнкі вынікаў іх работы ў адпаведнасці з рэальнымі дасягненнямі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ